***Тацяна ПАДАЛЯК,***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# Карпаратыўныя і агульначалавечыя каштоўнасці ў сучаснай журналістыцы

Патрыятызм – адна з фундаментальных каштоўнасцей грамадства, найважнейшы складнік ідэалогіі беларускай дзяржавы і разам з тым сутнаснае засваенне ўрокаў гісторыі. Невыпадкова ваенна-патрыятычная тэматыка, як сэнсавызначальная для Рэспублікі Беларусь, была і застаецца сярод прыярытэтных у сродках масавай інфармацыі ўсіх узроўняў, у тым ліку карпаратыўных. Безумоўным лідарам у гэтым накірунку з'яўляецца «Белорусская военная газета. Во славу Родины» («БВГ») – цэнтральны друкаваны орган Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

З пункту гледжання тыпалогіі СМІ, з улікам характару аўдыторыі, прадметна-тэматычнай скіраванасці і мэтавага прызначэння інфармацыі, выданне мае двайное падпарадкаванне. З аднаго боку, карпаратыўнае (спецыялізаванае, ведамасна-галіновае), паколькі выконвае функцыю інфармавання ваеннаслужачых аб дзейнасці Узброеных Сіл краіны, асвятляе армейскія будні, узнімае актуальныя для абароннага ведамства краіны пытанні.

З другога боку, «БВГ» адначасова з'яўляецца і агульнанацыянальным выданнем, разлічаным на шырокае кола чытачоў: тэматыка актуальная для ўсяго грамадства, спрыяе выхаванню патрыятызму, гонару за гераічнае мінулае Радзімы. Не будзе перабольшаннем сцвярджаць, што інфармацыйна-праблемнае поле газеты закранае кожную сям'ю: дзеючых ваеннаслужачых і тых, хто ўжо адслужыў, выканаў грамадзянскі абавязак; ветэранаў і юнакоў, што толькі рыхтуюцца стаць у строй, іх бацькоў, сваякоў і блізкіх; хвалюе гэтая тэматыка і дзяўчат, якія чакаюць сваіх салдатаў... Такім чынам, матэрыялы ваеннай газеты карысныя шырокаму колу чытачоў

менавіта таму, што беларуская армія – народная па сваёй сутнаснай прыродзе.

«Белорусская военная газета. Во славу Родины» адлічвае сваю гісторыю з 22 чэрвеня 1921 года, калі выйшаў першы нумар «Красноармейской правды». Непасрэднымі яе папярэднікамі былі армейскія газеты Заходняга фронту, што выходзілі ў 1919-1920 гадах: «Окопная правда», «Красная Звезда», «Красноармеец», «Воин революции». Адметная гісторыя газеты і перыяду Вялікай Айчыннай вайны, «Красноармейская правда» разам з войскамі дайшла да Кёнігсберга: у 1941-1944 гг. як газета Заходняга фронту, у 1944-1945 гг. – 3-га Беларускага фронту. Менавіта на старонках гэтага выдання ўпершыню надрукавана паэма А. Твардоўскага «Васіль Цёркін» [1, с. 345].

З 1947 года газета выходзіла пад назвай «Во славу Родины», з 8 мая 2004 г. – «Белорусская военная газета. Во славу Родины». Гэта штодзённае выданне, выходзіць 5 разоў на тыдзень, з аўторка па суботу, фарматам А3. Крэда-дэвіз газеты штонумар змяшчаецца над загаловачным комплексам – «Оперативно, достоверно и объективно о Вооруженных Силах Республики Беларусь». Газета рускамоўная, але друкуюцца матэрыялы і на беларускай мове. Тыраж на верасень 2013 г. – больш за 23 000 экзэмпляраў (агульная тэндэнцыя зніжэння тыражоў друкаваных СМІ закранула і «БВГ»: на студзень 2013 г. наклад выдання перавышаў 30 000).

Добра распрацаваная сістэма рубрыкацыі забяспечвае агульнае бачанне кантэнту кожнага нумара. Аператыўнае інфармаванне грамадскасці па пытаннях нацыянальнай бяспекі, дзяржаўнай палітыкі ў галіне абароны, будаўніцтва Узброеных Сіл забяспечваюць публікацыі ў рубрыках «Боевая подготовка», «За веру и Отечество», «Армейские будни», «Гарнизоны», «Уникальные подразделения». Фарміраванню высокага маральнага духу і патрыятычнай свядомасці ваеннаслужачых, выхаванню пачуцця асабістай датычнасці да абароны Айчыны прысвечаны матэрыялы рубрык «Солдатская среда», «Профессионалы», «Армия и личность», «Люди долга», «Молодые офицеры».

У «БВГ» рэгулярна публікуюцца інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы аб ваенна-палітычнай сітуацыі ў свеце, аб стане і перспектывах развіцця ваенных арганізацый замежных краін, удасканаленні тэхнікі і ўзбраення (рубрыкі «Союзники», «Международное сотрудничество», «Геополитика», «В армиях мира», «Азимут»).

Газета паспяхова распрацоўвае праекты, звязаныя з маральна-этычнай тэматыкай, маладзёжнай палітыкай, навукай, культурай, літаратурай і мастацтвам, спортам: рубрыкі «Страна, которую мы защищаем», «В зеркале времени», «Культурное пространство», «Увлечения», «Армейский спорт», інш. Карысная інфармацыя для юных чытачоў – у рубрыках «Допризывная подготовка», «Армия – детям».

Рэгулярна публікуюцца ў «БВГ» матэрыялы па пытаннях сацыяльнай абароны ваеннаслужачых, членаў іх сямей. Папулярнасцю ў чытачоў карыстаецца спецыяльны праект ваеннага інфармацыйнага агенцтва «Ваяр» «Семейная суббота».

«Белорусская военная газета. Во славу Родины» вызначаецца прафесіяналізмам, грунтоўнасцю і кампетэнтнасцю распрацоўваемай праблематыкі, высокім узроўнем журналісцкага майстэрства. На старонках выдання прысутнічаюць жанры ўсіх відавых груп: інфармацыйныя, аналітычныя, мастацка-публіцыстычныя. У працэсе збору і творчай інтэрпрэтацыі факталагічнага матэрыялу ваенныя карэспандэнты выкарыстоўваюць не толькі традыцыйныя для школы айчыннай журналістыкі формы, метады, прыёмы, але смела бяруцца за наватарскія: «выпрабавана на сабе», «журналіст змяняе прафесію» і іншыя «інтэрактыўныя» спосабы атрымання інфармацыі.

Цікавая рэдакцыйная задума, напрыклад, – прасачыць, дзе і як праходзілі службу вядомыя беларускія палітыкі і дзяржаўныя дзеячы, што дала ім армія. Прыцягвае ўвагу і адметны загаловак публікацыі: «VIPы в погонах» (23 лютага 2013 г.). Так, Аляксандр Радзькоў, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пасля заканчэн-

ня Магілёўскага педінстытута служыў тэрміновую з лістапада 1973 па лістапад 1974-га, у 120-й гвардзейскай Рагачоўскай мотастралковай дывізіі. У распараджэнні артылерыстаў была апаратура, якой і «на грамадзянцы» яшчэ не існавала: аналагавыя прыборы, лазерны далямер – але ў радавога Радзькова былі ў распараджэнні пераносны тэлефон і катушка з правадамі. Ён узгадаў: каб правесці сувязь ад агнявой пазіцыі да назіральнага пункта, даводзілася пераадольваць адлегласць па 5-7 кіламетраў... Уладзімір Андрэйчанка, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, быў прызваны ў армію вясной 1968 г. і накіраваны ў Чэхаславакію: «Нынешним молодым воинам из учебников истории и рассказов отцов известно, какая напряженная ситуация была тогда в ЧССР. Нам, еще новобранцам, пришлось овладевать военным делом и вместе с тем заниматься буквально с нуля строительством и полным оборудованием военного городка. Спали в палатках, на земле, трудились допоздна, но никто не хныкал, не жаловался. И не было для нас ничего вкуснее, чем солдатская каша!..» Міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі ў 1985 г. скончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітнае ракетнае вучылішча СПА, быў накіраваны ў Групу савецкіх войскаў у Германіі. Адзін вайсковы ўспамін для яго асаблівы: «В 1987 году во время 18-суточной поездки на стрельбы на один из степных полигонов у меня в Минске родилась дочь. Я узнал об этом в пути. Выполнил боевую задачу – дивизион тогда отстрелялся на отлично – и с разрешения командира вернулся домой самолетом, чтобы встретиться с семьей. Такое не забывается!» Уладзімір Дражын, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы і Фінляндскай Рэспубліцы, быў прызваны на тэрміновую службу ў 1966 г., праходзіў яе на працягу трох гадоў у адной з танкавых дывізій. Армейцы выконвалі ў ліку іншых задачы па прывядзенню ў належны стан воінскіх пахаванняў і брацкіх магіл: усталявалі помнікі ў Слонімскім раёне на брацкіх магілах у вёсках Азярніца і Клепачы...

Падобная публікацыя магла б стаць «цвіком» нумара лепшай рэспубліканскай грамадска-палітычнай газеты ў Дзень абаронцаў Айчыны.

Значную ўвагу ўдзяляе «БВГ» асвятленню героіка-патрыятычнай і ваенна-гістарычнай тэматыкі. У маі-чэрвені 2012 г. газета змясціла вялікае публіцыстычнае даследаванне Ігара Плугатарова «Гавроши Великой Отечественной» аб юных героях вайны, якія разам з бацькамі змагаліся з ворагам. Публікацыя выклікала шырокі рэзананс сярод чытачоў розных пакаленняў. 30 чэрвеня 2012 г. «БВГ» змясціла справаздачу аб круглым стале, арганізаваным Беларускім саюзам афіцэраў у народным музеі імя Батальёна беларускіх арлянят. Аўтар публікацыі Ігар Плугатароў атрымаў нямала станоўчых водгукаў, аднак некаторыя чытачы папракнулі даследчыка ў тым, што ён упусціў некалькі важных рэчаў: напрыклад, не згадаў пра юнгаў, павярхоўна распавёў пра сыноў палкоў, якія служылі ў Чырвонай Арміі. 9, 10 і 11 студзеня 2013 г. у рубрыцы «Военный архив» газета змясціла працяг даследавання "Гавроши Великой Отечественной. К завершению незавершаемой темы», прычым матэрыял утрымлівае шэраг малавядомых гістарычных фактаў.

У апошні час з'явілася новая кан'юнктура ў асвятленні Вялікай Айчыннай вайны, накіраваная ў многім не толькі і не столькі на пошук праўды, колькі на сенсацыйныя спробы «пераліцаваць» гісторыю самай страшнай за ўвесь час існавання чалавецтва вайны. Перш за ўсё стаўка робіцца на: маладаследаваную «пену» партызанскага руху; апраўданне калабарацыі; сцвярджэнні, што акупацыйны рэжым на Беларусі быў грамадзянскай вайной; тэндэнцыйна і адлакіравана пададзеную «беларушчыну» часоў фашысцкай акупацыі; узвелічэнне асобных нацысцкіх военачальнікаў; памылкі палітыкаў і ваенных стратэгаў; бяздумны падзел подзвігаў, здзейсненых у гады вайны, па нацыянальнай прыкмеце і г. д. Нярэдка можна назіраць, як нашчадкі тых, хто ваяваў на баку Гітлера, і нашчадкі ўдзельнікаў калабарацыянісцкага руху спрабуюць прадставіць

сваіх бацькоў і дзядоў сапраўднымі героямі, а бясспрэчных пераможцаў – агрэсарамі, акупантамі, прыгнятальнікамі.

Задача сумленнай журналістыкі – паставіць надзейную заслону фальсіфікатарам гісторыі Бацькаўшчыны. А для ваеннай газеты гэта, магчыма, і звышзадача – у сувязі з кан'юнктурай міжнародных адносінаў, звязаных з рознымі падыходамі, трактоўкамі і інтэрпрэтацыямі гісторыі Другой сусветнай вайны.

У 1996 г. пачаў выходзіць часопіс «Армия». Выдаюцца і дадаткі да яго: навукова-тэарэтычны «Наука и военная безопасность» (з 2003 г.), навукова-практычны «Идеологические аспекты военной безопасности» і літатарурна-мастацкі «Армия и культура» (абодва дадаткі – з 2008 г.).

9 лютага 2009 г. створана Ваеннае інфармацыйнае агенцтва Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь «Ваяр». З яго стварэннем завяршылася рэарганізацыя дзяржаўнай установы «Рэдакцыя ордэна Чырвонай Зоркі газеты «Белорусская военная газета. Во славу Родины» шляхам далучэння да яе ўстановы «Рэдакцыя часопіса «Армия» і рэдакцыі сайта Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. На Агенцтва ўскладзены функцыі рэдакцыі «Белорусской военной газеты. Во славу Родины» і часопіса «Армия». З 2011 г. «Ваяр» сумесна з Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам Рэспублікі Беларусь выдае часопіс «Военно-промышленный комплекс. ВПК. Беларусь. Military-industrial complex VPK Belarus». Па сутнасці, утварыўся медыяхолдынг ваенных СМІ.

Трывалае месца сярод электронных сродкаў масавай інфармацыі Беларусі займае ваеннае тэлебачанне. Першую тэлепраграму ў прафесійным фармаце ваенная тэлерадыёстудыя прадставіла для эфіру 15 красавіка 1994 года. Зараз «Ваен-ТБ» не толькі рыхтуе праграмы для нацыянальных тэлеканалаў, стварае і распаўсюджвае інфармацыйныя сюжэты для электронных СМІ, адначасова з'яўляецца і эфектыўным прадзюсарскім цэнтрам: займаецца вытворчасцю дакументальных і прэзентацыйных фільмаў, музычных кліпаў, сацыяльнай рэкламы.

Сюжэты тэлекампаніі размяшчаюцца ў інфармацыйных праграмах нацыянальных тэлеканалаў і, як правіла, носяць эксклюзіўны характар. Гэта сведчанне высокага прафесійнага майстэрства – патрапіць у фармат розных тэлеканалаў. Інфармацыйна-пазнавальная праграма «Арсенал» у эфіры з 1994 года. Пабудавана яна ў форме тэлечасопіса, традыцыйна выходзіць па нядзелях на канале «Беларусь-1». «Арсенал» – гэта ўсё, што ў арсенале арміі: ваенныя тэлежурналісты распавядаюць аб дзяржаўнай палітыцы ў галіне нацыянальнай бяспекі, будаўніцтве і развіцці Узброеных Сіл, гісторыі і сучасным жыцці арміі, ваеннай службе і людзях, якія прысвяцілі сваё жыццё прафесіі – абараняць Радзіму. З 2003 года ў эфіры тэлеканала «Сталічнае тэлебачанне» – праграма «Анфас». «Мы не баімся і не замоўчваем праблем, – тлумачыць генеральны дырэктар «Ваен-ТБ» Сяргей Мальцаў. – Мы абмяркоўваем іх твар-у-твар з гледачом. Невыпадкова слова “анфас” перакладаецца з французскай наступным чынам: “той, хто глядзіць у твар”. А ў нас ёсць яшчэ свая, дадатковая расшыфроўка, у рускамоўным варыянце: “Армейские Новости, Факты, Актуальные События”» [3]. З 2005 года на тэлеканале АНТ – «Ваенны агляд»: калейдаскоп самых цікавых вайсковых навін. Разам з ваенкарамі гледачы бываюць на палігонах, у аўдыторыях навучальных установ, воінскіх часцях, удзельнічаюць у вучэннях. Такім чынам, інфармацыйную прадукцыю «Ваен-ТБ» можна ўбачыць на ўсіх беларускіх тэлеканалах.

Спецыялісты адзначаюць: па меры таго, як адсоўваецца гістарычная мяжа вайны, яе сімвалічны змест змяняецца, «паколькі ўсё менш застаецца ўдзельнікаў і жывых сведкаў тых падзей і ўсё больш становіцца тых, хто мяркуе аб ёй толькі па «кніжках і кіно». На змену гістарычным пакаленням, датычным да той вайны, – захавальнікам жывых ведаў і ўспамінаў аб ёй, прыходзяць пакаленні гістарычных рэканструктараў і інтэрпрэтатараў. У гэтым кантэксце асаблівае значэнне набывае пытанне аб ідэйнай і канцэптуальнай пераемнасці новых

гістарычных пабудоў. Марк Феро назваў сусветную гіторыю разбітым люстэркам, міражом Еўропы, гісторыяй, якая перакройваецца ў залежнасці ад таго, што адбываецца з краінамі. Пры гэтым, на яго думку, кожная краіна выкарыстоўвае сваю гісторыю для апраўдання ўласнай палітыкі» [2, с. 7-8]. Па меркаванні расійскага гісторыка і палітолага Тамары Гузянковай, нацыянальныя эліты шэрагу новых, цяпер незалежных краін, каб павысіць свой статус, стаць больш рэспектабельнымі членамі «еўрапейскага клуба», імкнуцца да гістарычнай рэабілітацыі і гістарычнага рэваншу, і адным са спосабаў канструявання пазітыўнага іміджу дзяржавы становіцца перагляд яе ўкладу ў сусветную гісторыю. «Пры гэтым Другая сусветная вайна апынулася ў ліку тых гістарычных сюжэтаў, якія падвергліся перагляду перш за ўсё. І гэта наўрад ці выпадкова, паколькі Другая сусветная як гістарычны і сацыяльна-псіхалагічны феномен уздзейнічае на прынцыпова важныя формы калектыўнай памяці пакаленняў» [2, с. 8]. Перапісванне гісторыі многімі краінамі-ўдзельніцамі вайны «носіць сутнасны характар і нярэдна накіравана на радыкальную змену ўстойлівых прадстаўленняў аб тым, хто ў той вайне быў пераможцам, а хто пераможаным; хто прайграў, а хто выйграў; хто быў агрэсарам і захопнікам, а хто – абаронцам і ахвярай». [2, с. 8]. Пры гэтым даследчык занатоўвае: «...ролі, сыграныя краінамі ў Другой сусветнай вайне, да гэтага часу аказваюць істотны ўплыў на масавую свядомасць... Ваеннае мінулае закранае нацыянальнае самалюбства і, безумоўна, застаецца важным элементам гістарычнай рэпутацыі дзяржавы. Менавіта таму на працягу многіх гадоў столькі намаганняў трацiцца на тое, каб змяніць «карцінку», старанна прыбіраючы з яе сведчанні нацыянальнага сораму і паражэння, а на іх месцы сканструяваць міф аб славе і перамозе» [2, с. 8-9].

Такім чынам, фальсіфікацыя вайны – гэта на сёння ўжо праблема геапалітычнага парадку. І менавіта ракурс яе асвятлення выяўляе аксіялагічны напрамак выдання.

ЛІТАРАТУРА

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 2. Беліцк – Гімн / Беларус. энцыкл. ; Рэдкал. : Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] ; Маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1994. – 537 с.: іл.

2. Гузенкова, Т.С. У каждого своя война? (К проблеме интерпретаций истории Второй мировой войны в школьных учебниках стран СНГ и ЦВЕ) / Т.С. Гузенкова // «Расскажу вам о войне...» Вторая мировая и Великая Отечественные войны в учебниках и сознании школьников славянских стран / кол. авт. : Т.С. Гузенкова (отв. ред) и др. ; Рос. ин-т стратег. исслед. – М. : РИСИ, 2012. С. 8 – 21.

3. Падаляк, Т. Анфас і профіль ваеннага тэлебачання / Т. Падаляк // Звязда. – 2011. – 5 кастр. – С. 4.

***Анна ПЕТРОЧЕНКО***
*Белорусский государственный университет*

## Массмедийная коммуникация в условиях глобальных трансформаций (опыт финской региональной прессы)

Финляндия является одной из самых читающих стран мира: более 200 газет общим недельным тиражом около 3 млн. экземпляров печатаются для населения в 5,5 млн., 9 из 10 финнов читают газеты и журналы. Географические особенности государства обусловили высокую концентрацию жителей в городах, а сравнительно небольшая численность населения (Хельсинки – 579 тыс. (здесь и далее без учета жителей агломерации), Тампере – 209 тыс., Турку – 175 тыс.) привела к превалированию локальной прессы. Финляндия стала первой страной в мире, которая адаптировала концепцию национальной инновационной системы как базовый элемент политики в области науки и технологий, однако, несмотря на это, переход региональной прессы в «цифровой режим» (дигитализация – пожалуй, главная из глобальных тенденций) не был безболезненным процес-